ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

1981
10
СНЕЖНЯ
ЧАЦВЕР
№ 36 (1336)
Выходзіць раз у тыдзень

Цана 2 кап.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

## ФІНІШУ ГОДА — УДАРНАЯ ПРАЦА!



У авангардзе сацыялістычнага спаборніцтва ідуць лаўрэаты прэміі Ленінскага камсамола Беларусі І. ГУЛАКОЎ і С. ВЯТОХІН.

Фота В. ШАЧАКА.

"Беларускі універсітэт"
тэлетайп
• Учора • Сёння • Заўтра •

### НА КАНФЕРЕНЦЫІ

арганізацыі ДТСААФ універсітэта з дакладам выступіў старшыня камітэта ДТСААФ М. В. Гарлатаў, які адзначыў, што за справаздачны перыяд у БДУ праведзена 34 спаборніцтвы па ваенна-прыкладных відах спорту. У іх прынялі ўдзел 5 тысяч чалавек, 1287 з якіх атрымалі спартыўныя разрады. Значных поспехаў у арганізацыі абаронна-масавай работы дасягнулі хімічны, фізічны і геаграфічны факультэты.

У сацыялістычных абавязацельствах арганізацыі ДТСААФ, прынятых на канферэнцыі, намечаны новыя рубяжы.

У. БЯЛОЎ,
студэнт журфака.

### АДБЫЛОСЯ

пасяджэнне прэзідыума прафкома універсітэта. На парадку дня стаялі пытанні аб уплаце членскіх узносаў і арганізацыі агляду-конкурсу на лепшую вучэбную групу. Акрамя таго, гаворка ішла аб тым, як лепш правесці сацыялістычнае спаборніцтва, па якіх крытэрыях ацэньваць дзейнасць студэнцкіх груп. Усе выказаныя прапановы ўлічаны ў пастанове, прынятай прэзідыумам.

Р. МАРЧУК,
старшыня прэс-цэнтра прафкома.

### ПА ЗАПРАШЭННЮ

клуба «Субота», які створаны пры Доме самадзейнай творчасці, на гастролі ў Ленінград выязджаў студэнцкі народны тэатр БДУ. Нашы студэнты выступілі з двума спектаклямі па п'есе А. Валодзіна «Дзве стралы», на адным з якіх прысутнічаў аўтар твора.

Л. БАРАНОЎСКАЯ,
інструктар студэнцкага клуба.

### ТРАДЫЦЫЙНЫ ТЫДЗЕНЬ

в'етнама-савецкай дружбы пачаўся мітынгам у актавай зале. На ім выступілі прадстаўнік в'етнамскага зямляцтва Нгуен Ці Тхань, аспірант ФПМ, а таксама члены камітэтаў камсамола мехмата і Мінскага камвольнага камбіната. У праграме тыдня сустрэча з выкладчыкамі БДУ — ветэранамі вайны, выступленне перад піянерамі падшэфнай школы, спартыўны дзень, экскурсія ў Мір і Нясвіж, вечар інтэрнацыянальнай дружбы.

А. ЗАГРАЮК,
намеснік сакратара камітэта камсамола мехмата па інтэррабоце.

## Гісторыя — радкамі твораў

— Кнігі Леаніда Ільіча Брэжнева «Малая зямля», «Адраджэнне», «Цаліна» разам з новым яго творам «Успаміны» — адзінае аўтабіяграфічнае апавяданне, дзе праз лёс аднаго чалавека, які назаўсёды звязаў сваё жыццё з народам і партыяй, яскрава паказана біяграфія краіны....

— Чытаеш «Успаміны» — і быццам гутарыш з цікавым, разумным чалавекам, які вучыць кожнага жыць дастойна...

Гэта радкі з выступленняў на канферэнцыі чытачоў студэнтаў фізфака Г. Несцярук, В. Трыпуцькі. Яны і іх аднакурснікі М. Піскарова, Г. Навасёлава, В. Гасель, І. Харошман з вялікай увагай і цікавасцю аднесліся да новага твора Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Л. І. Брэжнева і змаглі гэта яскрава і шчыра перадаць кожнаму слухачу.

Аб асабістай сустрэчы з Леанідам Ільічом расказаў палкоўнік у адстаўцы В. А. Галабурда, якому Л. І. Брэжнеў у час вайны ўручыў партыйны білет.

У заключэнне сакратар партбюро фізфака дацэнт Н. М. Хаўратовіч падзякавала ветэранам вайны за ўдзел у канферэнцыі, якую фізікам дапамагалі арганізаваць і правесці савет ветэранаў вайны БДУ і аддзел абслугоўвання універсітэцкай бібліятэкі.

В. ВІШНЕЎСКІ,
студэнт фізфака.

БЫЦЬ ВЕРНЫМІ СПРАВЕ БАЦЬКОЎ

## Подзвігу 40 гадоў

НАВУКОВА - ТЭАРЭТЫЧНУЮ канферэнцыю, прысвечаную 40-годдзю перамогі ў бітве пад Масквой, якую арганізавалі з дапамогай гістарычнага факультэта савет ветэранаў вайны разам з аддзелам абслугоўвання універсітэцкай бібліятэкі, адкрыў сакратар партыйнага камітэта дацэнт М. Г. Елісееў. Аб гістарычным значэнні разгрому нямецка-фашысцкіх захопнікаў пад Масквой расказаў кандыдат гістарычных навук, старшыня савета ветэранаў вайны І. В. Марчанка.

«Вечна будуць жыць героі бітвы за Маскву ў сэрцах пакаленняў» — пад такім дэвізам выступалі студэнты-трэцякурснікі аб 28 героях-панфілаўцах, аб В. Талаліхіне, аб генерале Л. Даватару, аб З. Космадзям'янскай, аб студэнтах БДУ — абаронцах Масквы.

Пасля выступлення Героя Савецкага Саюза старшага выкладчыка БДУ М. Я. Зайцава успамінамі аб знамянальнай гістарычнай падзеі падзяліліся ўдзельнікі бітвы за Маскву генерал-лейтэнант артылерыі ў адстаўцы, Герой Савецкага Саюза І. С. Жыгараў і ветэран вайны, кандыдат эканамічных навук І. Т. Рагоўскі. На канферэнцыі прысутнічалі супрацоўнікі БДУ, якія ў гады фашысцкай навалы абаранялі сталіцу — Ф. Ф. Церашонак, А. С. Мізрахі, І. П. Аляксандраў, П. А. Бурынскі, А. І. Кажушкоў, М. А. Майракаў, М. І. Марэнка, В. М. Шпілеў.

Т. САХАШЧЫК,
наш кар.

## Выхоўваць ідэйную перакананасць

Сёння, калі ў нашай краіне створаны магутны матэрыяльна-тэхнічны і інтэлектуальны патэнцыял, рашаючымі ўмовамі эфектыўнага выкарыстання ўсіх пераваг сацыялізму становяцца высокія ідэйна-маральныя вартасці кожнага савецкага чалавека. Вось чаму асаблівую ўвагу партыя ўдзяляе пытанням далейшага ўзмацнення ідэйна-выхаваўчай і арганізацыйна-партыйнай работы, павышэння эфектыўнасці камуністычнага выхавання працоўных, якасці падрыхтоўкі і ідэйнай загартоўкі будучых спецыялістаў. Вялікая роля ў вырашэнні гэтых задач адводзіцца спецыялістам у галіне грамадскіх навук.

4 снежня адбылася нарада выкладчыкаў кафедраў грамадскіх навук ВНУ і вучоных-грамадазнаўцаў Мінска. Абмеркаваны праблемы далейшага павышэння ўзроўню выкладання грамадскіх дысцыплін у святле рашэнняў XXVI з'езда КПСС і рэкамендацый Усесаюзнай нарады загадчыкаў кафедраў грамадскіх навук.

У дакладзе міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР тав. М. М. Мяшкова, у паведамленнях удзельнікаў падкрэслівалася, што патрабаванне партыі па перабудове ідэалагічнай работы мае непасрэдныя адносіны да выкладання і навуковых даследаванняў усяго комплексу праблем грамадазнаўства. Задача вучоных-грамадазнаўцаў — дабіцца далейшага ўдасканалення выкладання марксісцка-ленінскай навукі як цэласнага вучэння ў непарыўным адзінстве яго састаўных частак, у цеснай сувязі з жыццём, практыкай камуністычнага будаўніцтва, пашырэння і паглыблення фундаментальных і прыкладных даследаванняў па актуальных пытаннях тэорыі, гісторыі і палітыкі КПСС.

На нарадзе выступілі і прадстаўнікі універсітэта — сакратар парткома дацэнт М. Г. Елісееў, загадчык кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў прафесар В. С. Сцёпін, загадчык кафедры педагогікі і методыкі выкладання грамадскіх навук ІПК пры БДУ імя У. І. Леніна, доктар філасофскіх навук М. Я. Ленсу.

На нарадзе выступіў сакратар ЦК КПБ тав. А. Т. Кузьмін.



Камсамолец С. СЕРГІЕНЯ, які працуе ў НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі, стаў пераможцай конкурсу на званне «Лепшы па прафесіі» сярод маладшых навуковых супрацоўнікаў інстытута ў 1981 годзе. Фота В. ГАРДЗЕЕВА.

● СПРАВЫ ПРАФСАЮЗНЫЯ

# ДА ПАСЛУГ КОЖНАГА

ПА РАШЭННЮ мясцкома прафсаюза БДУ імя У. І. Леніна для супрацоўнікаў і студэнтаў арганізавана грамадска-юрыдычная кансультацыя. Першы аўторак кожнага месяца з 15 да 17 гадзін у памяшканні мясцкома выкладчыкі юрыдычнага факультэта — спецыялісты па розных галінах савецкага права — даюць тлумачэнні па пытаннях грамадзянскага, працэсуальнага, сямейнага, працоўнага права, права сацыяльнага забеспячэння і іншых галін.

Чарговую кансультацыю правеў старшы выкладчык юрфака Я. Ануфрыеў. Група студэнтаў розных факультэтаў звярнулася з пытаннямі аб сумяшчэнні вучобы на стацыянары з работай у якасці рабочых ці служачых. Было растлумачана, што работа студэнта стацыянара не з'яўляецца сумяшчальніцтвам, але допускаецца толькі з дазволу дэкана факультэта ў вольны ад вучобы час. У выпадку адставання ў вучобе дэкан можа адмяніць гэту сваю згоду, і студэнт павінен пакінуць работу.

Калі студэнт да паступлення ў ВНУ або сярэднюю спецыяльную навучальную ўстанову працаваў у якасці рабочага або служачага ці служыў у Савецкай Арміі, то час навучання яго ўключаецца ў агульны працоўны стаж.

Калі ж да паступлення ў вышэйшую або сярэднюю спецыяльную навучальную ўстанову чалавек не працаваў у якасці рабочага ці служачага або не служыў у Савецкай Арміі, час вучобы ў працоўны стаж не ўключаецца. У гэтым выпадку ў стаж будуць уключацца толькі месяцы і дні яго работы, прычым незалежна ад таго — поўны працоўны дзень быў ці 0,5 дня, атрымліваў поўную стаўку (аклад) ці 0,5 стаўкі (акладу).

Аднак для назначэння пенсіі па інваліднасці час вучобы ў сярэдняй спецыяльнай або ў вышэйшай навучальнай установе ўключаецца ў агульны працоўны стаж незалежна ад таго, працаваў навучэнец да вучобы або не.

Паколькі работа студэнта стацыянара не з'яўляецца сумяшчальніцтвам, водпуск па рабоце (а ў выпадку звальнення —кампенсацыя за нявыкарыстаны водпуск) прадастаўляецца ў агульным парадку незалежна ад віду працоўнага дня.

Але трэба мець на ўвазе, што часовым і сезонным работнікам водпуск ці кампенсацыя, якая замяняе яго, пры звальненні не прадастаўляецца.

Наступная юрыдычная кансультацыя будзе праводзіцца 5 студзеня 1982 года.

**У. МАРЦІНОВІЧ,**
**загадчыца юрыдычнай кансультацыі, доктар юрыдычных навук, прафесар.**



На падрыхтоўчым аддзяленні БДУ імя У. І. Леніна завершаны набор слухачоў. У будучых гісторыкаў, філолагаў, фізікаў, журналістаў і матэматыкаў — у тых, хто вытрымаў субяседаванне па асноўных прафілірующых прадметах, пачаліся заняткі. Цяпер неабходна прыкласці ўсе намаганні, каб засвоіць праграму, бо толькі тых, хто вытрымае веснавую сесію, чакае поспех, а ў будучым — напружаная, але цікавая вучоба на любімых факультэтах.

НА ЗДЫМКАХ: слухачы філалагічнага факультэта і факультэта журналістыкі на сваіх першых занятках; субяседаванне праводзіць выкладчык кафедры нямецкай мовы М. А. ЧЭРКАС.

А. ВАЛОШЫН.
Фота аўтара.



ДА 40-ГОДДЗЯ ПЕРАМОГІ ПАД МАСКВОЙ

# Гістарычны ўрок

САВЕЦКІ НАРОД, усе прагрэсіўныя людзі нашай планеты адзначаюць у гэтыя дні 40-годдзе бітвы пад Масквой. Гэта бітва — не проста гістарычная падзея. Яна займае выключнае месца ў лёсе не толькі нашай краіны, але і ўсяго чалавецтва. У ёй, як і ў ходзе ўсёй Вялікай Айчыннай вайны, вырашалася пытанне аб жыцці Савецкай дзяржавы, аб свабодзе і незалежнасці нашага народа. Перамога над агрэсіўнымі сіламі фашызму пад Масквой прадвызначыла ўвесь ход далейшага сусветнага развіцця.

Супраць сталіцы Савецкага Саюза вораг у канцы верасня 1941 года сканцэнтраваў вялізныя сілы: больш за дзве пятыя ўсіх войск, тры чвэрці танкаў, амаль палову гармат і кулямётаў, каля трэці самалётаў, якія дзейнічалі на савецка-германскім фронце. Праціўнік перавышаў войскі Заходняга, Рэзервнага і Бранскага франтоў, якія вялі баі на Маскоўскім напрамку, у людзях у 1,4, у гарматах і мінамётах — у 1,8, у танках — у 1,7, у баявых самалётах — у 2 разы. Плану наступлення на Маскву ў пачатку кастрычніка 1941 года сіламі групы армій «Цэнтр» гітлераўскае камандаванне дало назву «Тайфун», падкрэсліваючы гэтым звяргаючую сілу націску, які рыхтаваўся.

Становішча для савецкіх войск у гэты час было надзвычай складаным: вораг валодаў не толькі колькасная, але і якаснай перавагай ва ўзбраенні. Больш паловы савецкіх танкаў і самалётаў былі ўстарэўшай канструкцыі, паколькі савецкая ваенная прамысловасць яшчэ не магла ў поўнай меры забяспечыць патрэбы дзейнічаючай арміі ва ўзбраенні і баявой тэхніцы з-за вымушанай эвакуацыі многіх прадпрыемстваў ва ўсходнія раёны краіны; на франтах ішлі цяжкія абарончыя баі, у выніку якіх войскі былі аслаблены; значныя сілы Чырвонай Арміі знаходзіліся на межах з Японіяй і Турцыяй.

У небяспечных абставінах, якія склаліся, савецкае камандаванне прымала экстраныя меры, каб спыніць ворага: па баявой трывозе былі падняты ваенныя вучылішчы, запасныя часці, падраздзяленні зенітнай артылерыі СПА і ўначы на 6 кастрычніка накіраваны да Мажайскай лініі абароны, створанай у асноўным рукамі працоўных Маскоўскай вобласці на рубяжы Валакаламск, Мажайск, Малаяраславец, Калуга.

Для паляпшэння кіравання войскамі Заходні і Рэзервны франты былі 10 кастрычніка Стаўкай аб'яднаны ў Заходні фронт пад камандаваннем генерала арміі Г. К. Жукава. Складаныя абставіны патрабавалі стварэння войскамі і працоўнымі новага рубяжа абароны на бліжніх подступах да Масквы. На будаўніцтва абарончых збудаванняў было мабілізавана 450 тыс. жыхароў сталіцы, 75 працэнтаў з іх складалі жанчыны.

Высокае пачуццё асабістай адказнасці абаронцаў Масквы за лёс сталіцы Радзімы, напружаная арганізатарская работа Камуністычнай партыі па стварэнню ўстойлівай абароны станоўча адлюстраваліся на ходзе баявых дзеянняў. У жорсткіх баях, якія разгарнуліся на мажайскім абарончым рубяжы з сярэдзіны кастрычніка і да пачатку лістапада, савецкія войскі аказалі ўпартае супраціўленне перавышаючым сілам ворага і затрымалі іх на рубяжы рэк Лама, Руза і Нара. Напружаныя баі ішлі ў ходзе калінінскай абароннай аперацыі, на тульскім напрамку.

Задачы непасрэднай абароны Масквы падначаліла ўсю сваю дзейнасць Маскоўская партыйная арганізацыя. Партыйны актыў сталіцы, які адбыўся 13 кастрычніка, пастанавіў: «...Мабілізаваць усю Маскоўскую партыйную арганізацыю, усіх камуністаў, камсамольцаў і ўсіх працоўных Масквы на адпор нямецка-фашысцкім захопнікам, на абарону Масквы, на арганізацыю перамогі».

Цвёрдую рашучасць — адстаяць Маскву — пацвердзіў рабочы клас сталіцы. Толькі ў першай палове кастрычніка Масква выставіла ў дапамогу фронту амаль 50-тысячную армію воінаў.

Мабілізацыя партыяй усіх сіл на абарону Масквы, гераічнае супраціўленне войск, мужнасць насельніцтва сарвалі першы націск ворага. Наступленне нямецка-фашысцкай арміі захліпнулася на парозе сталіцы. Вораг панёс значныя страты, але ад захопу Масквы не адмовіўся, падцягнуў падмацаванні, зрабіў перагрупіроўку войск.

Бітва за Маскву на яе другім этапе супала з 24-й гадавінай Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Вялікую ролю для павышэння маральнага духу абаронцаў сталіцы сыгралі ўрачыстае пасяджэнне Маскоўскага Савета дэпутатаў працоўных 6 лістапада 1941 года і ваенны парад, які адбыўся на Чырвонай плошчы ў Маскве 7 лістапада. Працоўныя нашай краіны, усяго свету ўспрынялі гэтыя падзеі як адлюстраванне маральнай перавагі і ўпэўненасці ў перамозе.

Рыхтуючыся да рашучай бітвы, савецкае камандаванне працягвала ўмацоўваць Заходні фронт. Павялічылася колькасць самалётаў, артылерыі, уключаючы рэактыўную. Раслі партыйныя рады — лепшыя байцы і камандзіры ўступалі ў партыю. Да пачатку лістапада ў войсках, якія змагаліся пад Масквой, налічвалася звыш 120 тысяч камуністаў — амаль 10 працэнтаў усіх армейскіх камуністаў. Вялікую дапамогу рэгулярнай арміі аказваў шырокі партызанскі рух. Толькі на тэрыторыі Маскоўскай вобласці барацьбу з акупантамі вялі звыш 40 партызанскіх атрадаў і 377 дywерсійных груп. Яны аб'ядноўвалі 15 тысяч народных мсціўцаў.

Наступленне нямецка-фашысцкіх войск аднавілася 15-16 лістапада. Танкавымі ўдарамі з раёнаў Валакаламска і Тулы гітлераўскае камандаванне разлічвала расчляніць нашы войскі, ахапіць Маскву з поўначы і поўдня.

Баі адразу ж прынялі жорсткі характар. Стойка трымала абарону 16-я армія пад камандаваннем К. К. Ракасоўскага. Войскі гэтай арміі — 316-я дывізія І. В. Панфілава, кавалерыйская група Л. М. Даватара, 1-я гвардзейская танкавая брыгада М. Я. Катукова, іншыя злучэнні і часці — мужна адбівалі страшэнны ўдар танкавага тарана і не прапусцілі ворага. Бессмяротны подзвіг здзейсніла каля раз'езда Дубасекава група знішчальнікаў танкаў на чале з палітруком роты В. Г. Клачковым. У тыя дні нарадзіліся крылатыя словы, якія выразілі пачуцці і думкі ўсіх абаронцаў Масквы, усіх савецкіх патрыётаў: «Вялікая Расія, а адступаць няма куды, ззаду Масква».

4 снежня другое «генеральнае» наступленне гітлераўцаў на Маскву было спынена. Вораг панёс у перыяд з 16 лістапада па 5 снежня вялізныя страты. На палях Падмаскоўя гітлераўцы страцілі 55 тысяч чалавек забітымі, звыш 100 тысяч раненымі і абмарожанымі, каля 800 танкаў, 300 гармат і да 1500 самалётаў. Маральны дух нямецка-фашысцкай арміі быў надломлены. Стварыліся ўмовы для пераходу савецкіх войск у контрнаступленне і разгрому ворага пад Масквой. Контрнаступленне пачалося 5 снежня ўдарамі Калінінскага фронту, якім кіраваў генерал І. С. Конеў. Днём пазней перайшлі ў наступленне войскі Заходняга фронту пад камандаваннем Г. К. Жукава.

Меч справядлівай кары падняўся каля сцен Масквы над галавой гітлераўскіх захопнікаў. Пераадолеўшы ўпартае супраціўленне ворага, войскі Калінінскага фронту 16 снежня вызвалілі Калінін, войскі правага крыла Заходняга фронту 20 снежня — Валакаламск, аператыўная група Паўднёва-Заходняга фронту дабілася поспеху ў раёне Ельца, Калугі, Казельска, Белева. Вораг быў адкінуты ад Масквы на 100—250 кіламетраў. У пачатку студзеня 1942 года контрнаступленне савецкіх войск завяршылася. Непасрэдная пагроза Маскве і ўсяму прамысловаму Маскоўскаму раёну была знята. У ходзе баёў Чырвоная Армія разграміла 38 варожых дывізій, у тым ліку 15 танкавых. За перыяд бітвы пад Масквой нямецка-фашысцкая армія страціла 500 тысяч чалавек, 1300 танкаў, 2500 гармат, больш за 1500 аўтамашын і шмат другой баявой тэхнікі.

Перамога пад Масквой паслужыла пачаткам карэннага павароту ў ходзе вайны, развеяла міф аб непераможнасці германскай арміі, мела буйное міжнароднае значэнне.

Перамога савецкіх войск у бітве пад Масквой была дасягнута дзякуючы перавазе савецкага грамадскага і дзяржаўнага ладу, непарушнай дружбе народаў нашай краіны, мудрай кіруючай і арганізатарскай дзейнасці Камуністычнай партыі.

Разам з воінамі розных нацыянальнасцей, аб'яднаных агульнымі класавымі інтарэсамі і мэтамі, самаадданa змагаліся на франтах вайны сыны і дочкі беларускага народа. У бітве пад Масквой праславіўся ўраджэнец Віцебскай вобласці генерал-маёр Л. М. Даватар. Яму пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Вызначыліся ў баях пад Масквой камандзір 1-й мотастралковай дывізіі палкоўнік А. І. Мізюкоў, камандзір танкавага батальёна капітан Г. А. Палаўчэня, удастоеныя звання Героя Савецкага Саюза, і многія іншыя.

Сярод удзельнікаў абароны Масквы былі выкладчыкі і студэнты Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Член камсамольскага камітэта БДУ Леанід Сокал, абараняючы ад ворага сталіцу нашай Радзімы, загінуў у адным з баёў. І зараз у калектыве універсітэта працуе 32 ветэраны вайны, якія прымалі непасрэдны ўдзел у баях пад Масквой. За вялікую работу па камуністычнаму выхаванню моладзі і ў сувязі з 40-годдзем разгрому нямецка-фашысцкіх войск пад Масквой ветэраны вайны Г. П. Аляксандраў, П. А. Бурынскі, І. Кажушкоў, М. А. Майракоў, М. І. Марэнка, А. С. Мізрахі, І. Т. Рагоўскі, Ф. Ф. Цэрашонак, В. М. Шпілеў, І. А. Юхо, Л. П. Янаў Мінскім абласным камітэтам ЛКСМБ узнагароджаны Ганаровымі Граматамі.

Час бяссільны аслабіць у сэрцах і розумах пакаленняў памяць аб гераічных абаронцах Масквы — сталіцы Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

**І. МАРЧАНКА,**
**кандыдат гістарычных навук, дацэнт, старшыня савета ветэранаў вайны універсітэта.**

**НА НЯДАЎНЯЙ СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНАЙ КАМСАМОЛЬСКАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ УНІВЕРСІТЭТА БЫЎ ВЫБРАНЫ НОВЫ САСТАЎ ШТАБА «КАМСАМОЛЬСКАГА ПРАЖЭКТАРА», ЯКІ З ПЕРШЫХ ДЗЁН З ЭНТУЗІЯЗМАМ УЗЯЎСЯ ЗА ДАРУЧАНУЮ СПРАВУ.**

**У СЁННЯШНІМ НУМАРЫ ВЫ ПАЗНАЁМІЦЕСЯ З НАШЫМ НОВЫМ СУПРАЦОЎНІКАМ, ЯКОГА ЗАВУЦЬ ЛІХТАРЫК. МЫ СПАДЗЯЁМСЯ, ШТО МАТЭРЫЯЛЫ, ПАДРЫХТАВАНЫЯ «ПРАЖЭКТАРЫСТАМІ» З ЯГО ДАПАМОГАЙ, ЗНОЙДУЦЬ ВОДГУК, ЗАЦІКАВЯЦЬ, ПРЫМУСЯЦЬ НЕКАТОРЫХ ПАЧЫРВАНЕЦЬ І ПРЫНЯЦЦА ЗА ВЫПРАЎЛЕННЕ ДАПУШЧАНЫХ НЕДАХОПАЎ.**

## «Іван ківае на Пятра»

Неяк аднойчы давялося Ліхтарыку пабываць у інтэрнаце № 6. Гаварыць аб гасціннай сустрэчы не прыходзіцца, бо дагэтуль там не арганізавана належнае дзяжурства членаў студсавета, адсутнічае неабходная інфармацыя на стэндзе студсавета. Дарэчы, ліфт таксама не працаваў, і ў падарожжа па паверхах інтэрната Ліхтарыку прыйшлося адправіцца пешшу. Прайшоўшы з трэцяга на дзесяты паверх, ён заўважыў шмат хібаў, якія даўно ўжо маглі быць выпраўлены. Маглі быць, але...

Больш двух месяцаў жывуць студэнты ў інтэрнаце, а да гэтага часу ў многіх пакоях няўтульна, не створаны адпаведныя ўмовы для працы і адпачынку. У вочы кідаецца звычайная неахайнасць жыхароў (напрыклад, у пакоях № 606, 303, 1015). Нямала пытанняў узнікла і ў адрас каменданта інтэрната С. П. Саламеннікавай. Вось што адказала яна на некаторыя заўвагі:

«Па-першае, у тым, што не працуе ліфт, вінаваты інжынер-энергетык С. С. Сапронаў. Іменна ён не арганізаваў для ліфцёра Т. В. Гайдыш праходжанне спецыяльнай вучобы. Хоць яна і залічана на работу з 23 верасня гэтага года, аднак прыступіць да яе не можа з-за адсутнасці допуску.

Па-другое, душ пачынае работу толькі з 10 гадзін з-за таго, што сантэхнік працуе па сумяшчэнню і раней прыходзіць не можа.

Па-трэцяе, гаспадарчы інвентар (настольныя лямпы, чайнікі, венікі, тазікі) не выдадзены з той прычыны, што аддзел забеспячэння не паклапаціўся своечасова аб яго набыцці».

Як кажуць, Іван ківае на Пятра... Дарэчы, чаму б студсавету інтэрната № 6 не ўзяць пад свой кантроль работу абслугоўваючага персаналу і не прапанаваць пасады ліфцёраў, сантэхнікаў, столяраў, тэхнічак самім студэнтам?

Пакідаў Ліхтарык інтэрнат № 6 з сапсаваным настроем. Мы спадзяемся, што паведамленне аб выпраўленні адзначаных недахопаў, дасланае ў адрас рэдакцыі і штаба «КП», дапаможа падняць настрой у Ліхтарыка.

## «Чаму пустуе «Гаўдэамус»?»

Памятаеце, як было ўспрынята адкрыццё студэнцкага кафэ «Гаўдэамус» у снежні мінулага года? Колькі было радасці, якія планы! Для гэтага былі свае прычыны: нарэшце і ў студэнтаў універсітэта паявілася сваё кафэ, дзе можна сустрэцца з сябрамі, правесці цікавы вечар. Але сёння на пытанне Ліхтарыка аб тым, як працуе «Гаўдэамус», у студэнцкім клубе універсітэта адказалі катэгарычна: «Дрэнна». Дрэнна, але чаму? У чым прычына такога рэзкага падзення папулярнасці кафэ? Іх, на жаль, нямала.

Першае, на што звярталі ўвагу ўсе студэнты, з якімі давялося пагутарыць Ліхтарыку, — «нецікава». Час першых захапленняў мінуў, і аўтарытэт студэнцкага кафэ трэба падтрымліваць штодзённай, карпатлівай, творчай работай. Яе ж яўна не хапае.

«Палажэнне аб студэнцкім кафэ «Гаўдэамус» прадугледжвае даволі значны штат работнікаў: дырэктар, адміністратар, кіраўнік дыскатэкі, вакальна-інструментальны ансамбль з шасці чалавек, кіраўнікі секцый і нават гуртка кройкі і шыцця. Ліхтарык не можа сказаць штосьці канкрэтнае аб рабоце кожнага з іх, але вынікі агульнай працы апладысментаў пакуль што не заслугоўваюць.

Слушнымі здаюцца Ліхтарыку прапановы аб стварэнні савета кафэ, у састаў якога ўваходзілі б студэнты ўсіх факультэтаў, які б згуртаваў, арганізаваў і спланаваў работу «Гаўдэамуса». Аб секцыях, якія пачалі было працаваць у мінулым годзе, пакуль што ні слуху, ні духу. Можа варта было б даць магчымасць кожнаму факультэту мець у кафэ «свой дзень», паспрабаваць арганізаваць сустрэчы студэнтаў розных мінскіх ВНУ, выпускнікоў БДУ мінулых гадоў. Хаця б на першым часе, пакуль пачнуць як след працаваць секцыі.

На жаль, нават такая простая праблема, як распаўсюджанне білетаў, на сённяшні дзень патрабуе энергічнага рашэння. Няўжо з'яўляецца лепшым існуючы варыянт, калі білеты прадаюцца чатыры разы ў тыдзень з 12 да 14 гадзін? Іменна ў гэты час ідуць заняткі першай змены, і каб купіць білет, трэба прапускаць лекцыі.

А ці прыемна атрымліваць у бары заказ на папяровай талерцы? На жаль, у кафэ не хапае належнага посуду.

Афармленне кафэ, на якое было затрачана столькі часу і намаганняў, так і не закончана. Узнікшая было ідэя пераабсталявання пад дыскатэку ніжняй залы павісла ў паветры.

Энтузіязму, дзелавых прапаноў, жадання ажыццявіць задуманае ў студэнтаў універсітэта шмат. У гэтым Ліхтарык змог пераканацца, гутарачы з наведвальнікамі кафэ. Але гэты энтузіязм патрэбна разумна выкарыстаць, накіраваць у неабходным напрамку. І зрабіць гэта павінен, на погляд Ліхтарыка, у першую чаргу студэнцкі клуб. Сёння ж ён далей канстатацыі дрэннай работы кафэ не ідзе. На жаль, пакуль у баку застаюцца і прафком, і камітэт камсамола. Праблем шмат. І рашаць іх трэба неадкладна, бо інакш ад кафэ застануцца толькі ўспаміны.

**У падрыхтоўцы матэрыялаў ЛІХТАРЫКУ дапамагалі студэнты ФПМ Я. ЦЕРАХАЎ, А. КАРТЫННІК, студэнты юрфака С. КАРАБЦОВА, Л. ВАДЗІНСКАЯ, І. ЖАЛУДОВА.**

**ДАВАЙЦЕ ПАЗНАЁМІМСЯ**

# ЦЭНТР ДЗЕЙНІЧАЕ

**МЦАНД — гэта міжвузаўскі цэнтр абслугоўвання навуковых даследаванняў па рэнтгенаструктурнаму аналізу і электроннай мікраскапіі пры БДУ імя У. І. Леніна. Назва, безумоўна, даволі гучная. Ды і не толькі назва. За год з лішкам свайго існавання МЦАНД актыўна ўліўся ў навуку, даў у рукі даследчыкаў неабходныя звесткі аб структуры рэчыва, атрыманыя пры дапамозе рэнтгенаўскіх праменняў і электронных пучкоў.**

**Наш карэспандэнт пабываў у лабараторыях міжвузаўскага цэнтра, сустрэўся з яго супрацоўнікамі.**

На рэнтгенаўскім дыфрактометры пачынаюцца здымкі цвёрдага рэчыва. Сама гэта прылада унікальная: дазваляе даць заказчыку неабходную інфармацыю аб цвёрдым целе. Рэнтгенаўскай здымцы падвяргаюцца металы, паўправаднікі, парашковыя рэчывы. Цяпер выконваецца заказ Інстытута ядзернай энергетыкі АН БССР. Інстытут прадставіў некалькі ўзораў матэрыялаў. Задача навуковых супрацоўнікаў МЦАНД —даць структурную характарыстыку кожнага рэчыва, «расказваць» матэрыял, выкласці поўную інфармацыю аб ім. І ўжо пасля такой «рэкамендацыі» міжвузаўскага цэнтра вучоным-энергетыкам прадастаўляецца рэальная магчымасць ствараць матэрыялы павышанай трываласці.

На іншых прыладах таксама ідзе даследаванне. Уключаны ў работу малавуглавая рэнтгенаўская ўстаноўка, электронны мікраскоп. Атрыманыя рэнтгенаграмы расшыфроўваюцца. Даследаванне аднаго матэрыяла займае, як правіла, ад трыццаці да ста мінут.

Асістэнт кафедры цвёрдага цела У. В. Углоў знаёміць з кнігай заказаў. Паслугамі цэнтра карыстаюцца вядучыя ВНУ і прадпрыемствы рэспублікі: Беларускі політэхнічны і Мінскі радыётэхнічны інстытуты, Фізіка-тэхнічны інстытут АН БССР, Гродзенскі дзяржаўны універсітэт, Мінскі трактарны завод... Кола заказчыкаў, як бачым, вялікае і прадстаўнічае. І да кожнага заказу навуковыя супрацоўнікі цэнтра падыходзяць творча: у залежнасці ад патрабаванняў яны прадастаўляюць звесткі аб структуры рэчыва ў неабходнай заказчыку форме. Такі метад работы, безумоўна, павышае эфектыўнасць выкарыстання навуковага патэнцыялу ВНУ.

**Каментарый загадчыка лабараторыі Уладзіміра Васільевіча Панарадава:**

— Міжвузаўскі цэнтр абслугоўвання навуковых даследаванняў працягвае развівацца. Акрамя супрацоўніцтва з ВНУ і прадпрыемствамі рэспублікі, на базе цэнтра праходзяць стажыроўку выкладчыкі ВНУ. Набліжаецца абарона кандыдацкіх дысертацый замежных аспірантаў, якія выконвалі даследаванні ў міжвузаўскім цэнтры. У кола пытанняў, вырашаемых МЦАНД, уваходзяць і распрацоўка метадычных і вучэбных дапаможнікаў, арганізацыя выканання курсавых і дыпломных работ, цэнтр аказвае кансультатыўную дапамогу па метадах правядзення структурных даследаванняў і пры інтэрпрэтацыі эксперыментальных даных. Пачалося стварэнне бібліятэкі праграм для апрацоўкі атрыманых рэзультатаў на ЭВМ.

Наш калектыў параўнальна малы: 6 штатных супрацоўнікаў і навуковы кіраўнік. Адчувальную дапамогу нам аказваюць матэматыкі-праграмісты вылічальнага цэнтра БДУ.

Міжвузаўскі цэнтр пакуль адзіны ў рэспубліцы. І я лічу, што ён адпавядае ўсім патрабаванням, якія ставяць прамысловасць і сучасная навука перад фізікай цвёрдага цела.

**І. ПАПКО,**
**наш кар.**



**НА ЗДЫМКУ: супрацоўнікі МЦАНД — старшы інжынер Ю. А. Даніловіч, загадчык лабараторыі У. В. Панарадаў, навуковы кіраўнік, дацэнт В. М. Анішчык, асістэнт кафедры фізікі цвёрдага цела У. В. Углоў, загадчык кафедры фізікі цвёрдага цела, прафесар У. П. Гольцаў абмяркоўваюць план работы цэнтра на 1982 год.**

**КАНФЕРЭНЦЫЯ ТАВАРЫСТВА «ВЕДЫ»**

# НА ПЕРАДАВОЙ ІДЭАЛАГІЧНАГА ФРОНТУ

**На справаздачна-выбарнай канферэнцыі таварыства «Веды» БДУ імя У. І. Леніна аб выніках двухгадовай работы расказаў старшыня праўлення, дацэнт кафедры навуковага камунізму В. І. Гамаў. Пасля справаздачы рэвізійнай камісіі і спрэчак па дакладах адбыліся выбары новага саставу праўлення, рэвізійнай камісіі, а таксама дэлегатаў на раённую канферэнцыю таварыства «Веды».**

МАГІСТРАЛЬНЫМ напрамкам усёй дзейнасці арганізацыі таварыства «Веды» БДУ за апошнія два гады была прапаганда сярод студэнцкай моладзі, працоўных Мінска і рэспублікі дакументаў XXV і XXVI з'ездаў КПСС, XXVIII і XXIX з'ездаў Кампартыі Беларусі.

Наколькі вялікую ўвагу мы ўдзялялі прапагандзе рашэнняў партыйных з'ездаў, сведчаць наступныя даныя. За два гады нашымі лектарамі прачытана каля 14 тысяч лекцый, у тым ліку па з'ездаўскай тэматыцы амаль 8 тысяч. Значны ўклад унеслі кафедры грамадскіх навук. Напрыклад, кафедра гісторыі КПСС ІПК сіламі сваіх слухачоў прачытала ў працоўных калектывах Мінска і рэспублікі 266 лекцый, кафедра гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў толькі за 1981 год па матэрыялах партыйных з'ездаў прачытала звыш 100 лекцый.

Уся лекцыйная прапаганда была набліжана да рашэння народнагаспадарчых задач. Аб гэтым сведчыць работа 8 народных універсітэтаў, у тым ліку такіх папулярных, як «Метады прыкладной матэматыкі ў кіраванні вытворчасцю і ў навуковых даследаваннях». Дарэчы сказаць, такога універсітэта няма ні ў адной ВНУ Мінска і рэспублікі наогул. Заслужаным аўтарытэтам карыстаецца на працягу 20 гадоў народны універсітэт прававых ведаў, народны універсітэт «Прырода» на біялагічным факультэце.

Мы стварылі два новыя народныя універсітэты па маральнаму выхаванню на ВА «Гарызонт» і «Камсамолка», якія вядуць кафедра этыкі, эстэтыкі, навуковага атэізму і кафедра навуковага камунізму, а таксама народны універсітэт пры Мінскім палацы чыгуначнікаў «Сям'я і права», якім кіруе юрыдычны факультэт сумесна з праблемнай лабараторыяй сацыялагічных даследаванняў. Акрамя таго, нашы лектары вялі актыўную работу ў адзінаццаці школах юных.

Разам з тым якасць і эфектыўнасць нашых выступленняў не заўсёды адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляе да нас сучаснае жыццё. Хаця ў цэлым большасць лекцый атрымлівае станоўчыя водгукі, мы маем звесткі, што асобныя лектары ідуць у масавую аўдыторыю непадрыхтаванымі, чытаюць лекцыі па канспектах, суха, спрабуюць пазбегнуць адказаў на вострыя пытанні. У кнізе «Успаміны» Л. І. Брэжнеў піша: «Калі аратар пазбягае адказаў на вострыя пытанні, то ён унушае людзям недавер. Калі лектар мямліць на трыбуне, паўтарае агульнавядомае, то карысці ад гэтага ні на грош, больш за тое, такі аратар можа адвучыць людзей наогул слухаць лекцыі. Фармалізм у гэтай справе супрацьпаказаны, абавязкова патрэбны творчы падыход».

Новаму праўленню таварыства «Веды» неабходна ўзмацніць патрабавальнасць да некаторых лектараў. Не сакрэт, што работа метадычных і тэматычных секцый носіць часам фармальны характар. Трэба нам падумаць, як зрабіць, каб кожная кафедра стала метадычным цэнтрам. Мае патрэбу ў далейшым паляпшэнні і работа школы маладога лектара.

Улічваючы, што 1982 год будзе насычаны такімі важнымі палітычнымі падзеямі, як 60-годдзе з дня ўтварэння СССР, пройдуць з'езды прафсаюзаў, камсамола і выбары ў мясцовыя Саветы народных дэпутатаў, нам прадстаіць распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы, накіраваныя на ўзмацненне патрыятычнага і інтэрнацыянальнага выхавання савецкіх людзей, прапаганды савецкага дэмакратызму, паказваць гераічную дзейнасць Ленінскага камсамола.

**В. ГАМАЎ,**
**старшыня прэзідыума таварыства «Веды».**

● СТУДЭНЦКАЯ РЭЦЭНЗІЯ

# БОЛЬ ДУШЫ ЧАЛАВЕЧАЙ

МАЛЕНЬКІ Іванка трывожна стукае ў акно — падыдзе да аднаго, другога, трэцяга і ўсё стукае. Іван Батрак сонны ўскоквае з ложка. Гэта стукае ў акно яго трывожнае дзяцінства, будзіць, не дае спакою.

Так пачынаецца новая кінастужка «Вазьму твой боль», створаная М. Пташуком на кінастудыі «Беларусьфільм» па аднайменнаму раману І. Шамякіна.

Жыццё Івана Батрака (артыст У. Гасцюхін) напоўнена трывогай, неспакоем, цяжкімі ўспамінамі аб ваенным ліхалецці. Яшчэ цяжэй становіцца жыць, калі нечакана для Батрака, калгаснага шафёра, паяўляецца ў вёсцы былы паліцай Рыгор Шышка (артыст Брэсцкага драмтэатра І. Мацкевіч). Здраднік адсядзеў 25 гадоў у турме і зноў вярнуўся дамоў. Вярнуўся здаровы, толькі пастарэў, вярнуўся, каб жыць, хадзіць па той зямлі, дзе ад яго рук, рук забойцы, загінулі сястра і маці Івана Батрака. І многія ў калгасе ўжо прымірыліся з тым, што на белым свеце існуе такі «чалавек». Не супакойваецца толькі Іван. Ён перапоўнены нянавісцю да здрадніка. Стваральнікі кінастужкі ставяць праблему існавання былых фашысцкіх здраднікаў, якая нікога не пакідае раўнадушным.

Творы ваеннай тэматыкі, асабліва тыя, дзе разглядаецца тэма выбару і здрадніцтва, для псіхалагічнага ўспрымання складаныя. Гледзячы фільм, мы адчуваем некаторыя спрашчэнні ў сцэнарыі ў адрозненне ад літаратурнага твора. На экране тэма здрадніцтва паказана дакладна, яна як бы выдзелена асобна, і ўсе другарадныя перыпетыі адстаўлены ў бок. Гэта тлумачыцца тым, што не заўсёды лёгка перанесці на экран усё тое, што напісана ў літаратурным творы.

Для кінематаграфіі пісаць вельмі цяжка, таму і прыходзіцца, экранізуючы аповесць або раман, некалькі мяняць паслядоўнасць сюжэту. У рамане І. Шамякіна няма такіх эпізодаў, дзе маленькі Іванка стукае ў акно і будзіць дарослага Івана. Фільм пачынаецца іменна так. І гэта творчая задума стваральнікаў кінастужкі вельмі ўдалая. Калі б аўтары ўзяліся экранізаваць усё тое, што напісана ў рамане, дык, пэўна, не хапіла б і дзвюх серый. У літаратурным творы жыццё Івана Батрака адлюстравана намнога глыбей, усебакова. Мы бачым яго дзяцінства, юнацтва, каханне, працу ў калгасе. Тэма сучаснасці, мірнага жыцця пераплятаецца з цяжкімі ўспамінамі аб вайне. Найвышэйшае псіхалагічнае напружанне дасягаецца толькі ў канцы рамана. У фільме пра юнацтва галоўнага героя мы даведваемся вельмі мала: акцэнт робіцца на дзіцячую памяць аб вайне, аб здрадніцтве, аб смерці самага блізкага чалавека — маці. Думаю, кінакарціна ад такой пастаноўкі не прайграла.

Стваральнікі фільма змаглі вельмі ўдала вызначыць асноўнае, паказаць тое, што найбольш за ўсё хвалюе гледача, —ходзяць яшчэ сёння па нашай зямлі тыя, хто ў цяжкія гады ліхалецця катаваў людзей. Ці мае права той жа Шышка, адсядзеўшы 25 гадоў у турме, хадзіць побач з людзьмі, над якімі калісьці здзекаваўся? Наша сумленне ніяк не мірыцца з такім становішчам, у душы мы хочам пакараць Шышку больш суровай карай — ён гэтага заслугоўвае. Але дзе выйсце? Аўтары карціны робяць гэта проста — жонка Батрака, ролю якой выканала Г. Яцкіна, забівае здрадніка. Тут напружанне гледача спадае — так здрадніку і трэба. Але ці ж так у жыцці? Складваецца ўражанне, што фільм зроблены некалькі сузіральна, таму што адсутнічае глыбокае псіхалагічнае рашэнне праблемы. Забіць лягчэй за ўсё, але ці будзе ад гэтага лягчэй жыць на свеце Івану Батраку?

Фільм «Вазьму твой боль»— сур'ёзнае пачынанне беларускага кінематографа ў мастацкім вырашэнні складанай жыццёвай праблемы.

**А. ВАСІЛЬКЕВІЧ,**
**студэнт журфака.**

● РАСКАЖУ ПРА ТАВАРЫША

## Наш стараста

**ЁН ПРЫЕХАЎ вучыцца ў БДУ з далёкага Мадагаскара. На факультэце журналістыкі амаль адразу звярнулі ўвагу на прынцыповы, адкрыты характар гэтага студэнта і прапанавалі яго кандыдатуру на пасаду старасты замежных студэнтаў.**

**Ларан Раманана, наш стараста,— сумленны і чулы сябар, адзін з лепшых студэнтаў. Сваімі ведамі ён стараецца падзяліцца з усімі намі. Як стараста ён вельмі патрабавальны —імкнецца зрабіць так, каб усе мы абавязкова наведвалі заняткі.**

**Раманана актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці. Ён — прэзідэнт зямляцтва мадагаскарскіх студэнтаў. Часта выступае ў школах і на прадпрыемствах з лекцыямі аб сваёй краіне, актыўна ўдзельнічае ва ўсіх факультэцкіх мерапрыемствах.**

**Мне вельмі падабаецца яго спакойны характар, нешматслоўе. Ён дакладна выражае думкі і ніколі не дае пустых абяцанняў.**

**Л. РАЗАФІНДРАЛАМБУ,**
**студэнт журфака.**

ТУРЫСЦКІМІ МАРШРУТАМІ

# ПА РЭКАХ КАЎКАЗА

КАЛІ ЗА АКНОМ вагона паплылі твары праважаючых, думка «мы едзем на Каўказ, да цяпла!» не пакідала нас, бо ў Мінску ўжо мацнеў марозец. Мы, група турыстаў з НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі, адпраўляліся ў водны паход III катэгорыі складанасці па каўказскіх рэках Урух і Церак. Дарога туды была не блізкай, і мы паспелі за гэты час прывыкнуць адзін да аднаго і ўстанавіць свае «няпісаныя» законы. Атмасфера добразычлівасці і разумення панавала ў групе з першага да апошняга дня.

Вёў групу Валянцін Уладзіміравіч Баркоў, ён жа быў капітанам на першым плыце, на другім — Мікалай Шчорс, а байдаркай кіраваў Сяргей Працко. Усяго было 10 удзельнікаў.

19 кастрычніка, на світанні, мы выязджалі з Арджанікідзе ў напрамку Калухі, невялікага населенага пункта каля Урухі. У той жа дзень спусціліся на ваду. Маршрут пачынаўся ад Дзігорскай цясніны, найпрыгажэйшага месца з тых, якія мы бачылі. Стаіш на мосце — уніз метраў 40, уверх — не палічыць, а пад табой бурліць, грыміць, пеніцца, б'ецца аб камяні вада!

На маршруце нас чакалі 3 складаныя парогі і вялікая колькасць самых незвычайных паваротаў, заліваў, глыб. Трэба аддаць належнае нашым капітанам, іх уменню выбраць адзіна правільнае рашэнне.

Не абышлося без здарэнняў — на першым парозе байдарка села на камень, і каб зняць яе, спатрэбілася шмат сіл, энергіі і яшчэ больш аптымізму. Потым з ёй, пашматанай, трэба было нешта рабіць. І на наступны дзень пасля рамонту байдарку зноў спусцілі на ваду.

Напэўна, людзі ідуць у паходы, каб праверыць сябе, свае сілы, свой характар — там яны сапраўды правяраюцца, бо складаных становішчаў хапае. Але яшчэ ходзяць з цікаўнасцю: а што там, за гарызонтам?! Як у песні—«...за туманом, за мечтами и за запахом тайги». Цягне імкненне больш убачыць, даведацца, памацаць рукамі тое, што называюць людзі словам «прыгажосць» — усход сонца над Казбекам, снег на яго вяршынях, «...и неба светлое свечение, и речек сильное течение» —чалавек павінен усё спасцігаць сам. На Каўказе нам прыгажосці хапала, ды і надвор'е дапамагло — ніводнага дожджыка ці хмары.

Паходы яшчэ і тым прыцягваюць людзей, што даюць цудоўную магчымасць пагутарыць — часу ўвечары каля кастра шмат. І размова бывае своеасаблівай — праз песні. У нас яна атрымалася, напэўна, таму, што незвычайныя людзі былі побач, здзіўляючыя па прастаце сваёй і душэўнай цеплыні. А песні былі самыя розныя, у залежнасці ад выбранай тэмы «размовы» — задушэўныя, лірычныя, як у В. Долінай, сумныя і светлыя, як у Б. Акуджавы і А. Дольскага, песні-роздумы, песні-набат, як у У. Высоцкага і іншыя, якія ў горадзе, дома гучаць зусім не так.

Аб тых добрых днях кастрычніка прыемна было ўспомніць, калі праз некаторы прамежак часу мы сабраліся разам пасля паходу—паглядзець фатаграфіі, слайды (у групе амаль усе фатаграфавалі), яшчэ раз, хаця б у думках, прайсці сваім маршрутам.

Усіх, хто хоча праверыць сябе дарогай, цяжкасцямі, сябрамі, каму не па нораву хатняя ўтульнасць, хто рамантык не толькі ў душы, запрашаем да нас, у секцыю воднага турызму БДУ. Ініцыятарам яе стварэння з'яўляецца Ф. Ермаліцкі, супрацоўнік НДІ ПФП, вялікі энтузіяст гэтай карыснай і патрэбнай справы.

**А. НЕЖАВЕЦ,**
**інжынер НДІ ПФП**
**імя А. Н Сеўчанкі,**
**удзельніца паходу.**
Фота **аўтара.**



# У ГАРАХ ПАЎНОЧНАГА ЗАБАЙКАЛЛЯ



**НАЙБОЛЬШ вопытным турыстам нашай рэспублікі давялося ўдасканальваць сваё спартыўнае майстэрства на зборах па падрыхтоўцы кіраўнікоў складаных пешаходных падарожжаў. Зборы праводзіліся ў раёне Паўночнага Забайкалля, там, дзе скрозь горныя хрыбты Удакан і Кодар зараз пракладваецца заходняя ветка БАМа.**

**Гэты раён цікавы ва ўсіх адносінах: горныя сістэмы Паўночнага Забайкалля выключна багаты карыснымі выкапнямі (каляровыя і чорныя металы, вугаль), геаграфічная унікальнасць яго заключаецца ў тым, што на Кодары суседнічаюць такія, здавалася б, несумяшчальныя зоны, як пустыня, тайга, тундра і скалы, леднікі і балоты. Адміністратыўная і транспартная сталіца гэтага краю — пасёлак з магічнай назвай Чара. Чара на працягу ўсяго летняга сезона мае сувязь з астатнім знешнім светам толькі пры дапамозе самалётаў і верталётаў. Вось у такім здзіўляючым і экзатычным раёне пралеглі маршруты найвышэйшай, пятай катэгорыі складанасці чатырох груп беларускіх турыстаў.**

**Аўтару гэтых радкоў пашчасціла быць у групе пад кіраўніцтвам вопытнага турыста, кандыдата ў майстры спорту СССР В. Кажуры. У састаў яе ўвайшлі студэнт V курса хімічнага факультэта Ю. Грыгор'еў, інжынер Інстытута геахіміі і геафізікі АН БССР М. Ігнаценка, прадстаўнікі некалькіх турысцкіх клубаў рэспублікі. Перад намі стаяла складаная задача: здзейсніць на працягу 20 дзён больш чым 250-кіламетровы паход з пераадоленнем звыш дзесятка складанейшых перавалаў.**

**Першая частка падарожжа пралягла па Цэнтральнаму Кодару. Найбольш складанымі былі перавалы Сюрпрыз, Ленінградзец, перавал Чатырох.**

**Шмат было работы ў нашага кінааператара М. Ігнаценкі (у паходзе здымаўся фільм для Беларускага тэлебачання). Яму прыходзілася працаваць не толькі ледарубам, але і кінакамерай. У гэтым раёне па просьбе Інстытута геахіміі і геафізікі АН БССР была выканана і некаторая навуковая работа.**

**Другая частка падарожжа праходзіла ў раёне Усходняга Кодара. Тут найбольш цяжкай перашкодай для нас быў перавал Спартак. Асаблівасць гэтых месц — складанасць праходжання далін рэк, большасць з якіх у сваёй плыні стварае каскады каньёнаў. У далінах гэтых рэк растуць у асноўным карлікавыя бярозкі і кедры, скрозь зараснікі якіх прыходзілася літаральна прадзірацца.**

**Але вось паход закончаны. Мы яшчэ доўга будзем памятаць хмурае кодарскае неба, суровыя скалы і леднікі, а галоўнае — тое сапраўднае пачуццё таварыства, якое ўзнікае толькі ў гарах. Паход закончаны, а гэта значыць, што наступае час падрыхтоўкі да наступных падарожжаў па нашай неабсяжнай краіне.**

**М. ФРЭНКЕЛЬ,**
**навуковы супрацоўнік**
**НДІ ФХП.**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

10 снежня 1981 г.

Зак. 1968. АТ 00831

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ